**У цяперашні час назіраецца складаная сітуацыя ў развіцці маўленчай актыўнасці дзяцей з-за недастатковасці жывых зносін, якія замяняюць камп'ютар і тэлевізар. Таму педагогі ясляў-сада № 33 Ліды вялікую ўвагу ўдзяляюць маўленчаму развіццю дзяцей, якое ўключае ў сябе валоданне маўленнем як сродкам зносін і культуры, узбагачэнне актыўнага слоўніка; развіццё звязнага маўлення; развіццё маўленчай творчасці. Таксама знаёмяць выхаванцаў з кніжнай культурай, мастацкай літаратурай свайго народа і народаў іншых краін, фальклорам, вучаць суперажываць персанажам мастацкіх твораў.**



# Маленькія казачнікі

Наша мэта — сфарміраваць у дзяцей навыкі самастойнай слоўнай творчасці праз выкарыстанне казачнага матэрыялу і напісанне ўласных тэкстаў казачнага зместу. Вядомы італьянскі казачнік Джані Радары падкрэсліваў, што "дзеці доўга застаюцца ў дачыненні да казак кансерватыўнымі; яны не хочуць што-небудзь мяняць у іх, настойваюць на тым, каб казка расказвалася адным і тым жа чынам і амаль аднымі і тымі ж словамі". Потым, на яго думку, настае момант, калі з'яўляецца патрэба ў новых уражаннях ад старой казкі. І тады дзеці прыдумваюць для яе новы канец ці надзяляюць героя новымі ўласцівасцямі, што спрыяе развіццю ў дзяцей звязнага маўлення, разуменню магчымасці падбіраць словы з падобным ці супрацьлеглым значэннем.




Казкі не толькі знаёмяць дзяцей з культурай, звычаямі, але і прымушаюць іх смяяцца і суперажываць, хвалюючыся за герояў, вучаць адрозніваць дабро ад зла, праўду ад хлусні, даюць першыя паняцці аб справядлівасці, сумленні, гонары, высакароднасці і заслужаным пакаранні. Яны прымушаюць любіць навакольны свет.

У сістэму адукацыйнага працэсу па развіцці маўленчай творчасці дашкольнікаў мы ўключылі такую цікавую форму работы, як складанне казачных тэкстаў, фантастычных гісторый. Дзеці знаёмяцца з разнастайнымі метадамі прыдумвання казак, вучацца выкарыстоўваць усе неабходныя элементы ў сваіх кампазіцыях, што ў значнай ступені павышае іх узровень слоўнай творчасці. Навучанне складанню тэкстаў казачнага зместу мае сістэмны характар. Работу пачынаем з параўтварэння знаёмых дзецям казачных тэкстаў "Казкі-блізняты", "У краіне казак", дзе дзеці ўдасканальваюць уменне аналізаваць змест казак, вылучаць падабенства і адрозненні сюжэтаў. Выхаванцам даём магчымасць бачыць варыятыўнасць і змяняльнасць казак, дзеянняў з пэўнымі героямі. У гульнях "Угадай, хто схаваўся", "Так — не", "Угадай герояў па апісанні", "Казка задам наперад" развіваем здольнасці да фантазіравання. З вялікім задавальненнем дзеці вучацца перарабляць знаёмыя казкі, мяняючы герояў, іх дзеянні. Дзеці самастойна прадумваюць задуму і назву казкі, выбіраюць тэмы, сюжэт, герояў.



З другой малодшай групы праводзім навучанне па складанні казак па метадзе "каталога" (работа з кнігай). Сутнасць гэтага метаду — у пабудове звязнага тэксту казачнага зместу з дапамогай выбраных наўгад носьбітаў (герояў, прадметаў, дзеянняў), у якім абавязкова дабро перамагае зло. Выкарыстанне гэтага метаду спрыяе зняццю псіхалагічнай інерцыі і стэрэатыпаў у прыдумванні казачных герояў, іх дзеянняў і апісання месца, дзе ўсё адбываецца. Пры складанні казак па метадзе "каталога" выконваецца пэўны алгарытм:

1. Выбар якой-небудзь кнігі для прыдумвання казкі па ёй.
2. Зварот да дзяцей з пытаннямі, на якія яны "знаходзяць" словы на разгорнутай старонцы тэксту.
3. Паступовы збор у адзінае цэлае адказаў, "знойдзеных у кнізе".
4. Прыдумванне назвы складзенай казкі.
5. Аднаўленне ўсяго тэксту кім-небудзь з дзяцей.
6. Пераказ базавых крокаў стварэння казкі. Вывядзенне паслядоўнасці пытанняў.
7. Арганізацыя прадукцыйнай дзейнасці.

Прыкладныя пытанні (старшая група):

1. Жыў-быў... Хто? Які ён быў?
2. Пайшоў гуляць (падарожнічаць)... Куды?
3. Сустрэў якога злога персанажа? Якое зло персанаж усім рабіў?
4. Быў у нашага героя сябар. Хто? Які ён быў? Як ён мог дапамагчы сябру? Што стала са злым героем?
5. Чым сталі займацца нашы героі?

Пры складанні казак выкарыстоўваем схемы-мадэлі і раскадроўку (схематычная выява прыдуманай гісторыі).

Казачныя тэксты, складзеныя дзецьмі (5—6 гадоў):

***"Казка пра каштан"***

*Жыў-быў каштан. Ён быў круглы як балабушка, карычневы як хлеб, коўзкі як лёд, але вельмі вясёлы.*

*Неяк пайшоў ён гуляць па дарозе. Раптам бачыць злога воўка, які ўсіх пужае і кусае.*

*У каштана быў сябар слон, які быў павольны як чарапаха, але вельмі добры. Каштан паклікаў свайго сябра. Слон схапіў воўка і аднёс у балота. У балоце жыў кракадзіл. Яны папрасілі яго прагнаць воўка. Кракадзіл стаў рыкаць, і воўк збег. А сябры сталі разам гуляць і весяліцца.*

***"Гісторыя пра зайца"***

*Жыў-быў заяц. Ён быў белы з блакітнымі вачамі і вельмі вясёлы.*

*Пайшоў ён гуляць па дарожцы да рэчкі і раптам сустрэў вожыка, які быў вечна злым. Вожык стаў бегаць за зайцам і калоць яго калючкамі. Але ў нашага зайца быў сябар пеўнік, які паспяшаўся на дапамогу. Яны прагналі вожыка, а самі паспяшаліся на рэчку; там яны плюхаліся ў вадзе і гулялі ў мяч.*

*Усе прыдуманыя казачныя тэксты змяшчаюцца ў чароўную кнігу. У час работы ў дзяцей узнімаецца настрой, знімаецца псіхалагічнае напружанне. Гэтая форма работы спрыяе згуртаванню дашкольнікаў.*

Аналіз складзеных дзецьмі казак паказаў, што пасля праведзенай работы была выяўлена станоўчая дынаміка развіцця фантазіі і слоўнай творчасці ў выхаванцаў.

**Святлана ХОМІЧ,
выхавальніца ясляў-сада № 33
Ліды.**